6+

Леанід Спаткай

# *Нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы Беларусі*



Леонид  Спаткай

# Нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы Беларусі

«Издательские решения»

**Спаткай Л.**

Нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы Беларусі / Л. Спаткай — «Издательские решения»,

ISBN 978-5-44-831875-7

У кнізе аналізуецца працэсс станаўлення беларускай сімволікі.Адрасавана шырокаму колу чытачоў, у першую чаргу тым, хто цікавіцца геральдыкай, вексілалогіяй і гісторыяй Беларусі.

ISBN 978-5-44-831875-7

© Спаткай Л.

© Издательские решения

# Содержание

Прадмова 6
Герб 8
Конец ознакомительного фрагмента. 64

# Нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы Беларусі

Леанід Уладзіміравіч Спаткай

© Леанід Уладзіміравіч Спаткай, 2024

ISBN 978-5-4483-1875-7
Создано в интеллектуальной издательской системе Ridero

# Прадмова

Сцяг і герб з'яўляюцца важнымі сімваламі дзяржаўнага суверэнітэту і як толькі краіна дабіваецца незалежнасці, яна ўрачыста заяўляе пра свае сімвалы: герб і сцяг.

Сцягі лунаюць над дзяржаўнымі ўстановам і падчас афіцыйных мерапрыемстваў, а таксама на флагштоках караблёў. У большасці сваёй сцягі – гэта прамавугольныя палотнішчы, аднакаляровыя або састаўленыя з рознакаляровых палос, на некаторых з іх маюцца геральдычныя выявы або надпісы.

Правобразамі сцягоў былі ваенныя знакі ў выглядзе шастоў з рознымі фігурамі на вяршынях, часта ўпрыгожаныя каляровымі стужкамі. Такія знакі выкарыстоўваліся са старажытных часоў, напрыклад, вядомы іх выявы на рэльефах Старажытнага Егіпта і Асірыі. У Старажытным Рыме да шастоў сталі мацаваць каляровыя палотнішчы. Рымляне называлі такія знакі словам «вексілумм». Менавіта гэта слова і стала асновай для назвы дапаможнай гістарычнай дысцыпліны – вексілалогіі, якая вывучае флагі і сцягі (Уласна сцягі падраздзяляюцца на дзве вялікія групы, якія ў рускай мове маюць назвы «флаги» і «знамена». У беларускай мове ўсе яны называюцца «сцягі», што не зусім тоеснае, таму, каб пазбегнуць блытаніны, слова «сцяг» далей будзе ўжывацца як тоеснае рускаму «знамя»).

У старажытнасці больш распаўсюджанымі былі сцягі. Іх мелі вайсковыя падраздзяленні, рамесніцкія цэхі, гандлёвыя кампаніі, каралі і імператары, бо правілы класічнай геральдыкі дазвалялі любому ўладальніку герба мець і сцяг (гербавы штандар) аналагічнага малюнка.

Флагі ж раней выкарыстоўваліся ў асноўным на флоце, бо маракам было важна здалёк вызначыць прыналежнасць сустрэчнага карабля. Затым паступова флагі «перакачавалі» на сушу.

Найбольш важнымі і шануемымі з'яўляюцца дзяржаўныя і нацыянальныя флагі. Нацыянальны флаг – гэта сімвал нацыі, які ў мананацыянальных краінах, як правіла, выкарыстоўваецца ў якасці дзяржаўнага. Ува ўсіх краінах да сваіх нацыянальных і дзяржаўных флагаў адносяцца з вялікай павагай і пашанай, а за іх абразу можна атрымаць буйны штраф або іншае суровае пакаранне. У некаторых краінах у знак вялікай пашаны да флага просты чалавек можа вывешваць ля свайго дома толькі маленькі сцяжок або вымпел нацыянальных колераў і то толькі па вялікіх святах, напрыклад, у Дзень незалежнасці.

Многія флагі ўяўляюць сабой спалучэнне палос розных колераў, размешчаных вертыкальна або гарызантальна. Таму палосы на флагу прынята пералічваць зверху ўніз або ад дрэўка да вольнага боку. Напрыклад, флаг Францыі правільна называць «блакітна-бела-чырвоны».

Пры вертыкальным вывешванні палотнішча, якое складаецца з гарызантальных палос, яго верхняя паласа павінна размяшчацца злева ад гледача, а ніжняя – справа.

Правобразы гербаў – розныя сімвалічныя выявы, што змяшчаліся на вайсковым рыштунку, сцягах і асабістых рэчах, выкарыстоўваліся яшчэ ў старажытнасці. У творах Гамера, Вергілія, Плінія і іншых антычных аўтараў сустракаюцца запісы аб выкарыстанні такіх знакаў. Прычым, уласныя эмблемы мелі як рэальныя, так і легендарныя асобы. Напрыклад, уласнай эмблемай Аляксандра Македонскага быў марскі канёк (гіпакамп), які ўпрыгожваў яго шлем, шлем Ахілеса упрыгожваў арол, шлем цара Нумідзіі Масінісы – сабака, шлем рымскага імператара Каракалы – арол.

Шчыты таксама ўпрыгожваліся рознымі эмблемамі, напрыклад, выявай адсечанай галавы Гаргоны Медузы. Але многія гэтыя знакі выкарыстоўваліся як упрыгожанне, таму часта змяняліся ўладальнікамі, не перадаваліся ў спадчыну і іх ужыванне не рэгламентаваліся ніякімі правіламі.

Большасць старажытных цывілізацый мелі ў сваёй культуры некаторыя элементы геральдыкі, напрыклад, сістэму пячатак. У Асірыі, Вавілоне і Старажытным Егіпце пячаткі выкарыстоўваліся, як затым і ў сярэдневяковай Еўропе, для пасведчання дакументаў. Таму некаторыя эмблемы дзяржаўных утварэнняў антычнасці выкарыстоўваліся на працягу стагоддзяў: на манетах, медалях, пячатках. Многія гэтыя рэчы захаваліся да нашага часу, дзякуючы чаму вядома, што эмблемай Афін была сава, Карынфа – Пегас, Самоса – паўлін, вострава Родас – ружа. З III тыс. да Р.Х. існаваў «герб» шумерскай дзяржавы – арол з галавой ільва. Эмблемай Егіпецкага царства была змяя, Арменіі – каранаваны леў, Персіі – арол. Затым арол стаў гербам Рыма, а гербам Візантыйскай імперыі, якая хацела аб’яднаць пад сваёй уладай абедзве часткі былой Рымскай імперыі, стаў двухгаловы арол, які затым «пераляцеў» на гербы Албаніі, Расіі, Сербіі і некаторых іншых краін.

Такім чынам, розныя геральдычныя знакі і эмблемы існавалі ўсюды і заўжды, але ўласна гербы з’явіліся ў Еўропе толькі ў X ст. Гэта былі гербы рыцараў, якія сталі затым радавымі, а некаторыя з іх – і дзяржаўнымі. Так, у аснове амаль усіх дзяржаўных гербаў еўрапейскіх краін былі радавыя гербы дынастый. Напрыклад, на гербе Даніі – тры блакітных леапарды на залатым полі, усеяным чырвонымі сэрцамі. На гербе Швецыі львы падтрымліваюць шчыт, яны ж знаходзяцца ў другой і трэцяй частках шчыта самога герба. Леў і на гербе Фінляндыі. На гербах Бельгіі, Нідэрландаў і Люксембурга таксама леў – старажытны герб герцагаў Бургундскіх. Льва можна ўбачыць і на гербах іншых краін. А на гербах Аўстрыі, Албаніі, Балівіі, Германіі, Інданезіі, Ірака, Калумбіі, Лівіі, Мексікі, Польшчы, Сірыі і многіх іншых краін прысутнічае другі старажытны сімвал дзяржаўнай улады – арол.

Сімвалы Беларусі не маюць ні выявы арла, ні выявы льва. Тым не менш іх гісторыя пачынаецца ў глыбіні вякоў амаль адначасова з гісторыяй беларускага народа. Менавіта аб гэтым і будзе аповед, які, спадзяюся, будзе карысны не толькі тым, хто цікавіцца гісторыяй і геральдыкай, але і ўсім жыхарам нашай краіны і яе суседзяў.

# Герб

Першыя гербы, як гербы ў поўным сэнсе гэтага слова, з'явіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі прыкладна ў XIV ст. Яны, у адрозненне ад рыцарскіх заходнееўрапейскіх гербаў, мелі іншае паходжанне. З незапамятных часоў нашы продкі балты-ліцвіны і славяне-крывічы карысталіся рознымі сімвалічнымі знакамі, якія служылі ім не толькі знакамі маёмаснай прыналежнасці, але і знакамі-абярэгамі, якія павінны былі дапамагаць іх уладальнікам у паўсядзённым жыцці або абараніць іх падчас вайсковай справы. Выявы гэтых сімвалаў змяшчаліся як на прадметах бытавога ўжытку (упрыгожанні, жыллё, адзенне і г. д.), так і на прадметах вайсковага рыштунку (зброя, сцягі і г. д.).

Традыцыі гэтыя зарадзіліся яшчэ ў паганскія часы, а хрысціянства затым прынесла свае асаблівасці: так, напрыклад, у якасці абарончых сімвалаў-абярэгаў воіны сталі выкарыстоўваць выявы анёлаў або святых, якіх лічылі сваімі нябеснымі заступнікамі. Вядома вялікая колькасць разнастайных геральдычных знакаў, якія таксама выкарыстоўваліся ў якасці вайсковых сімвалаў-абярэгаў. У шматлікіх летапісах, на фрэсках і барэльефах сабораў і цэркваў, на іконах, у археалагічных крыніцах знаходзім звесткі аб гэтых знаках. Часцей за ўсё гэта геаметрычныя фігуры: прамыя або касыя («андрэеўскія») крыжы, зоркі з чатырма, шасцю або васьмю канцамі-промнямі, радзей – рэальныя або міфічныя істоты.



Таму першыя ўласныя гербы таксама мелі просты выгляд. Часцей за ўсё гэта былі спалучэнні розных ліній, часта выкарыстоўваліся эмблемы, асновай якіх з'яўлялася выява стралы, мяча, крыжа, падковы або маладзіка.





*Знакі Рурыкавічаў (В. С. Драчук «Дорогами тысячелетий»)*

Напрыклад, уласным гербам Вялікага князя Альгерда (1345—1377) была выява крыжа з джаламі стрэл уверсе і ўнізе.





*Пячатка и магчымы герб Вялікага князя Альгерда*

Гербам Вялікага князя Вітаўта быў відазменены герб «Трызуб», які атрымаў назвы «Слупы Гедымінавічаў», або «Калоны»:



Герб кіеўскага Вялікага князя Уладзіміра Святаславіча



Герб полацкага князя Ізяслава Уладзіміравіча




Полацкія герб на пячатцы маскоўскага Вялікага князя Івана Жахлівага



Сучасны герб г.Заслаўя

Сам жа «Трызуб» з’яўляецца стылізаванай выявай пікіруючага ўніз сокала – радавога знака-татэма даіндаеўрапейскага часу.



Ён адпавядае старадаўняму ўяўленню аб сонцы як аб сокалу, што захавалася да нашага часу ў загадцы-прымаўцы: «Прыйшоў воўк – народ змоўк, узляцеў ясны сакол – народ вясёл», дзе «воўк» – цёмная ноч, «ясны сакол» – сонца. Сокалападобным быў і старажытнаславянскі бог агню і свету Рарог, і ў некаторых славянскіх мовах гэта слова захавалася да нашага часу, напрыклад польскае «rarog» і чэшскае «raroh» у перакладзе – сокал. Стылізаваная выява пікіруючага сокала была радавым знакам і летапіснага князя Рурыка, або Рарога.

Гэтыя і іншыя радавыя гербы змяшчаліся на пячатках, грошах, вопратцы, надмагільных плітах, будынках і г. д. Прычым самымі характэрнымі колерамі гэтых ранніх гербаў былі белы і чырвоны: або белая (срэбная) фігура змяшчалася ў чырвоным полі шчыта, або наадварот – чырвоная ў срэбным полі. Гэтыя колеры шырока выкарыстоўваліся ў сімволіцы славян здаўна: яшчэ аўтар «Слова аб палку Ігаравым» упамінае чырвоныя і белыя харугвы і чырвоныя шчыты ваяроў.

Прагеральдычныя знакі нашых продкаў, як і згаданы «Трызуб», у большасці сваёй адпавядалі або мелі сувязь з паганскімі божаствамі. Так, галоўным бажаством нашых продкаў быў бог Святла і Сонца Дажбог, ці Купала. Яго колер – чырвоны, а сімвал яго – васьміпрамянёвая зорка-кветка. Гэты сімвал і зараз добра вядомы і папулярны сярод нашага народа: ён сустракаецца ў вышываных і тканых нацыянальных узорах і арнаментах, у архітэктурным дэкоры пабудоў і інш.



Гэты сімвал атрымаў шырокае распаўсюджанне і пашану сярод продкаў беларусаў не выпадкова, бо згодна са старадаўнімі легендамі, свой радавод яны вялі ад самога Дажбога-Купалы, таму аўтар «Слова аб палку Ігаравым» і называе нашых продкаў Дажбожжымі ўнукамі.

Даволі часта на прадметах вайсковага ўжытку сустракаецца і эмблема бога вайны, грому і маланкі – Перуна: шасціпрамянёвая зорка, або кола з шасцю спіцамі. Гэты Перуноў знак і сёння можна ўбачыць у многіх беларускіх вёсках – ён размяшчаецца на сценах хат і гаспадарчых пабудоў. Гэта выява, па павер'і, абараняе жыллё і пабудовы разам з іхнімі насельнікамі ад гневу Перуна – удару маланкай. Выява знака Пяруна знака на шчытах і латах або кальчузе воіна таксама павінна была захаваць іх уладальніка ад гневу Перуна – ад паразы ў баі.



Задоўга да прыняцця хрысціянства нашым продкам была вядома і выява крыжа, ці чатырохпрамянёвай зоркі, прычым касы, ці «андрэеўскі», крыж таксама з'яўляўся знакам-абярэгам воіна. Гэты сімвал абароны і ачышчэння азначаў ачышчальнае ахвярнае славянскае вогнішча, малітву, што злучае чалавека з богам.

Прамы ж крыж, ці чатырохпрамянёвая зорка, – гэта сімвал росквіту і стварэння, сімвал усёабдымнай сілы Бога. Разыходзячыся ва ўсе бакі свету, яна ўяўляе сабой сімвал квітнеючага Сусвету.

Не менш за Дажбога шанавалі нашы продкі і бога Ярылу. Па іх уяўленнях, Ярыла – гэта сын Дажбога, юнак, які верхам на белым кані аб'язджае зямлю. Ён апрануты ў белую кашулю, басаногі, у руках трымае жытнія каласы, на галаве – вянок з палявых кветак. Па слову маці сваёй, жонкі Дажбога, багіні Лады, Ярыла адчыняе вароты нябёсаў і з'язджае з неба на зямлю – у гэты час пачынаецца вясна.

Прыняцце хрысціянства Полаччынай было больш доўгім па часе і больш мірным па спосабе, чым гэта было ў Кіеўскай Русі, якую «Пуцята хрысціў мячом, а Дабрыня – агнём», таму ў свядомасці беларусаў хрысціянства да сённяшняга дня мірна ўжываецца з паганскімі вераваннямі і звычаямі. У немалой ступені гэтаму спрыяла і сама царква, служыцелі якой, стараючыся вынішчыць у паствы паганскія вераванні і абрады, прызначалі дні хрысціянскіх свят на дні паганскіх, а хрысціянскіх святых «прызначалі» замест паганскіх багоў быць нябеснымі патронамі спраў зямных. У выніку гэтага ўладаром маланкі і грому стаў святы Ілля, ён жа стаў заступнікам падарожнікаў і воінаў. Грамавы знак Перуна (шасціпрамянёвая зорка, ці кола з шасцю спіцамі) пад уплывам хрысціянства пераўтварыўся ў шасціканцовы роўны крыж (іншая назва – падвоены крыж), які таксама лічыўся знакам-абярэгам воіна на полі бітвы. Як і маланка на небасхіле, выява гэтага шасціканцовага крыжа – срэбная (белая) ці, радзей, залатая (жоўтая) на блакітным ці цёмна-блакітным полі.




Гэты крыж мае падабенства са старажытным каталіцкім крыжам «Свечыц» (у яго пашыраюцца канцы), а таксама з праваслаўным патрыяршым крыжам і крыжам Святой Еўфрасінні Полацкай (іх верхняя перакладзіна карацей за ніжнюю).



Дарэчы, патрыяршыя крыжы прысутнічаюць у дзяржаўных гербах Венгрыі, Славакіі, Літувы і некаторых іншых кран.

У еўрапейскай геральдыцы існуе некалькі назваў падвойнага крыжа: «патрыяршы», «ларанскі», «венгерскі», «архіепіскапскі», «бенедыктынцаў», а таксама «крыж Кірылы і Мяфодзія».

Але ўсе гэтыя назвы адпавядаюць толькі асобным перыядам гісторыі, а назва «патрыяршы крыж» сведчыць, што крыж такой формы выкарыстоўваецца ў якасці знака адрознення патрыярхаў царквы.

Калі гэты крыж быў абраны архіепіскапамі царквы ў якасці знака сана – невядома, але ў еўрапейскай геральдыцы падвойны крыж вядомы з XV ст. Прыкладна з гэтага часу вядомы і герб Ордэна Бенедыкта: падвойны крыж на трайным пагорку, маючым дэвіз.

У паўднёваславянскіх краінах падвойны крыж таксама вядомы як крыж Святых Кірыла і Мяфодзія і фактычна звязаны з духоўнай асветай славянскіх народаў. Назву ж «ларанскі»

падвойны крыж атрымаў у сувязі з тым, што Рэне Анжу, герцаг Ларанскі (з 1431 г.), у 1435 г. стаў каралём Венгрыі, гербам якога быў падвойны крыж.



Несумненна, што падвойны крыж заходніх і паўднёвых славян паходзіць з Візантыі, дзе ён быў вядомы да IX ст. У Візантыі існавала некалькі розных тыпаў выяваў крыжа. Шматлікія іконы маюць як выявы простага (лацінскага) крыжа з распятым Хрыстом – Распяцце, так і выявы падвойнага крыжа, які ўваскрэсшы Хрыстос трымае ў сваёй руцэ. Ад гэтага падвойны крыж стаў сімвалам Уваскрэсення.

З IX ст. заходнеславацкае княства Нітра стала усходняй часткай Вялікамараўскай імперыі на якую імкнулася распаўсюдзіць свой уплыў Візантыйская імперыя праз распаўсюджанне хрысціянства. Менавіта таму сюды ў 863 г. візантыйскім імператарам Міхаілам III была накіравана місія на чале з манахамі-прапаведнікамі святым Кірылам (Канстанцінам) і яго братам, святым Мяфодзіем. Няма сумнення, што менавіта браты-асветнікі славян прынеслі ў Славакію выяву падвойнага крыжа і тлумачэнне яго сімволікі. У наш час у Еўропе падвойны крыж з’яўляецца сімвалам трох выдатных рэлігійных дзеячаў. якія аднесены да ліку святых. Гэта святы Бенедыкт – бацька заходнееўрапейскага манаства і святыя Кірыл і Мяфодзій – асветнікі славянскіх народаў. А чырвоны і срэбны колеры крыжа сімвалізуюць кроў і цела Хрыста.

У X-XI ст. тэрыторыя Славакіі паступова ўвайшла ў склад Венгерскага каралеўства. што ўзнікла замест Вялікамараўскай імперыі. У складзе гэтага каралеўства тэрыторыя Славакіі складала Паўночнае княства. Гэта княства ў розныя часы мела розны палітычны статус, што залежала ад таго, хто быў уладаром княства. Так, князь Бэла (1048—1060), брат караля Эндру I, быў амаль самастойным манархам з уласнымі васаламі, войскам і незалежнай знешняй палітыкай, якая часам была скіраванай нават супраць яго брата-караля. Бэла чаканіў і ўласныя манеты, якія мелі большую каштоўнасць. чым манеты караля. На гэтых манетах і змяшчаліся першыя вядомыя ў Славакіі выявы падвойнага крыжа ў выглядзе вертыкальнай лініі, якая перасякае дзве паралельныя гарызантальныя. Такім чынам, ужо ў XI ст. у славакаў падвойны крыж з’яўляўся не толькі рэлігійным сімвалам, але і палітычным – сімвалам дзяржаўнага суверэнітэту.



Як вядома, узнікненне геральдыкі звязана з крыжовымі паходамі. Менавіта для таго. каб адрозніць у клубах пылу на полі бітвы закаваных у латы сваіх воінаў ад варожых. рыцары пачалі наносіць на свае шчыты якія-небудзь простыя выявы.

У якасці такога знака адрознення ў 1189 г. венгерскі кароль Бэла III, які збіраўся прыняць удзел у Трэцім крыжовым паходзе. змясціў на свой шчыт выяву падвойнага крыжа – сімвала, быўшага к гэтаму часу ўжо добра вядомым у каралеўстве. Такім чынам, падвойны крыж стаў гербам венгерскага караля. а ў хуткім часе і першым гербам Венгрыі. У сучасным гербе Венгрыі ён змяшчаецца ў левай палове шчыта.



Вялікі князь Ягайла таксама меў уласны герб з выявай шасціканцовага крыжа, з пашыраючыміся канцамі.



Менавіта такі крыж быў змешчаны на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь, прынятым у 1991 г. Але ўсе названыя крыжы адрозніваюцца ад падвоенага тым, што або маюць перакладзіны рознай даўжыні, або гэтыя перакладзіны размяшчаюцца на рознай адлегласці ад вяршыні і падножжа; у падвойным жа крыжы ўсе канцы аднолькавай даўжыні і адлегласць паміж перакладзінамі аднолькавая з канцамі крыжа.



Так, як і Пярун, паступова было выцеснена са свядомасці нашых продкаў і другое паганскае бажаство – Ярыла. Яго «замяніў» святы Георгій Пераможац, якога ў нас часцей за ўсё называюць святы Юры. Гэтаму ў немалой ступені паспрыяла як падабенства іх імёнаў (Ярыла = Юры – Гюргі – Георгій), так і супадзенне дня святога Юрыя з Ярылавым днём (6 мая – пачатак вясны, першы выган статка ў поле. «Да Юр'я павінна сена хапіць і ў дурня», – кажа народная прымаўка).

Як сведчаць хрысціянскія крыніцы, святы Юры—Георгій – гэта рэальна існаваўшая асоба. Вядома, што Георгій нарадзіўся ў Кападокіі, служыў у рымскіх легіёнах пры імператару Дыяклетыяне (каля 243—313) і стаў знатным кападакійскім военачальнікам, меў заслужаныя пашану і славу, але адрокся ад тытулаў, знатнасці і багацця, прыняўшы хрысціянства. За выкрыццё паганства і распаўсюджванне хрысціянства Георгій зведаў жорсткія пераследы

і страшныя катаванні. Вядома, што ў 303 г. ён быў закатаваны насмерць пасля васьмідзённых здзекаў. За свае мукі і мужнасць, непахісную веру ў Збавіцеля Георгій быў кананізаваны. Лепшыя якасці святога Георгія праявіліся ў яго подзвігах, адным з якіх было выратаванне ім царэўны Аі (Аны) ад дракона. Мітрапаліт Макары у Вялікай Мінеі (XVI ст.) так апісвае гэты подзвіг: «У палесцінскім горадзе Гавале пасяліўся ў возеры вялікі змей, якому жыхары павінны былі аддаваць на з'ядзенне сваіх дзяцей. Калі чарга дайшла і да царскай дачкі, святы Георгій з'явіўся ёй ля возера, дзе яна стаяла, прынесеная ў ахвяру, і загадаў ёй, абвязаўшы драконаву галаву сваім пасам і аброццю каня, завесці яго ў горад. Царэўна выканала загад Перамаганосца, і калі яна прывяла пачвару ў горад, святы Георгій адсек яму галаву мячом і такім чынам звярнуў у хрысціянства ідалапаклоннікаў Гавальскіх». Гэтаму апісанню адпавядаюць выявы подзвігу святога Георгія ў заходнееўрапейскім жывапісу і на праваслаўных іконах, толькі на іконах святы Георгій не з мячом, а з кап'ём.

Царква абрала святога Георгія нябесным апекуном рыцараў – удзельнікаў крыжовых паходаў супраць мусульман і паганцаў. Выява святога Георгія ў выглядзе коннага рыцара мае глыбокі сэнс: белы (срэбны) колер вершніка і яго каня сімвалізуе чысціню хрысціянства і вернасць запаветам Хрыста, меч – сродак барацьбы за веру, чырвоны колер – поле, залітае крывёю ворагаў хрысціянства. Шмат якія знатныя людзі і цэлыя народы лічылі святога Георгія сваім нябесным апекуном і абаронцам. Напрыклад, выява коннага воіна на княжацкіх пячатках і гербах полацкіх і маскоўскіх князёў – сведчанне іх паходжання ад агульных продкаў – кіеўскіх князёў, нябесным заступнікам якіх лічыўся святы Георгій, бо дакладна вядома, што пачынальнікам роду полацкіх князёў Ізяславічаў з'яўляецца князь Ізяслаў – сын Вялікага князя кіеўскага Уладзіміра і полацкай князёўны Рагнеды.



*Пячатка князя Ізяслава, знойдзеная ў Ноўгарадзе ў 1953 г.*

Гербам Вялікага князя Вітаўта быў відазменены герб «Трызуб», які атрымаў назвы «Слупы Гедымінавічаў», або «Калоны»:



*Ноўгарадскія манеты з выявай «сабельника» – «саблицы»*

Дарэчы, на пячатках і манетах князёў выява вершніка сустракаецца даволі часта. У рускай сфрагістыцы пячаткі з выявай вершніка вядомы з першай паловы XIII ст. У гэты час самым распаўсюджаным сюжэтам пячатак была выява двух святых, якія азначалі імя князя і імя яго бацькі. Так, напрыклад, на пячатках князя Мсціслава Мсціславіча (пам. у 1328) – выява вершніка ўправа з дзідай у руцэ і шасціканцовым крыжам над плячом. Да гэтага ж часу адносіцца і пячатка князя Усевалада Юр’евіча з выявай вершніка на яе адваротным баку. А на пячатках Аляксандра Неўскага была выява каранаванага вершніка ўправа, які трымаў у правай руцэ падняты меч. Падобныя выявы мелі на сваіх пячатках Юрый Даўгарукі, Дзмітрый Данскі, Барыс Цвярскі, Іван Мажайскі і полацкія князі. Такім чынам, вершнік, узброены мячом або дзідай, – вельмі распаўсюджаная выява на пячатках князёў. Гэта выява потым з’явілася і на маскоўскіх грошах XIV – XVI ст.



***Пячаткі князя Аляксандра Яраслававіча, зяця полацкага князя Брачыслава***



***Пячатка полацкага князя Нарымунта-Глеба (1330)***



***Пячатка пскоўскага князя «з літоўскага роду» Аляксандра (1331)***

Падобныя выявы сустракаюцца і на пячатках польскіх князёў: Мешкі Старога, Конрада Мазавецкага, яго сыноў Баляслава і Казіміра, Пшамыслава Велікапольскага; чэшскіх каралёў Пшамыслава Отакара і Вацлава II.

Адной з найстаражытнейшых вядомых пячатай з такой выявай з’яўляецца пячатка князя люцічаў Багуслава, датуемая 1170 г.



А самая старажытная з падобных – са старажытнага Егіпту.



На тыповасць выявы вершніка ў заходнееўрапейскай сфрагістыцы, нумізматыцы і геральдыцы, асабліва з XIV ст., звяртаюць увагу шматлікія даследчыкі геральдыкі. Напрыклад, М. П. Сотнікаў лічыць, што гэта конная выява святога Георгія, які ў Візантыі лічыўся патронам імператара і яго войска. А геральдыст XIX ст. Б. Кёне лічыў, што такі тып выяваў існуе каля 2000 гадоў, – упершыню выява вершніка сустракаецца на дынарыях рымскага сямейства Фантэя, затым на імператарскіх манетах – і азначае, што імператар паражае варожага воіна. З увядзеннем хрысціянства замест воіна з'явілася выява дракона і кампазіцыя стала сімвалізаваць перамогу хрысціян над паганцамі.

У наш час падобныя выявы маюць гербы некаторых гарадоў і краін. Напрыклад, выява Святога Георгія – Дзяржаўны герб Грузіі.



Гербы Грузіі 1918 г.,1990 г. і 2004 г

А на старажытным гербе Вялікага княства Маскоўскага (цяпер – герб Масквы) у чырвоным полі конны воін у белай (срэбнай) брані забівае дзідай цмока. Як лічаць некаторыя гісторыкі, гэты герб адлюстраваў жаданне, а потым і падзею, якая здзейснілася, – збаўленне рускіх княстваў ад татара-мангольскага ярма.



Аверс пячаткі Вялікага князя Маскоўскага Івана III (1497)



Герб Вялікага князя Маскоўскага на нямецкай гравюры (канец XVI ст.)

Не менш старажытны і не менш вядомы і другі герб з выявай святога Георгія-Юрыя: у чырвоным полі конны воін у срэбнай брані з занесеным для ўдару мячом у правай руцэ. Гэта старажытны герб крывіцкай, а потым і полацкай зямлі і полацкіх князёў Ізяславічаў.

Менавіта ў сярэдневякоўі, з умацаваннем Полацкага княства і пашырэннем яго межаў, пашыралася тэрыторыя выкарыстання полацкага герба. У любой краіне таго часу герб яе ўладара станавіўся гербам краіны; так і герб полацкіх Ізяславічаў, дзе б ні княжыў князь з гэтага роду, заўсёды змяшчаўся на пячатцы і на вайсковай харугве княства, з’яўляючыся яго дзяржаўным сімвалам.



*Вершнікі на пячатках полацкіх і навагародскіх князёў*

Такім чынам, прыкладна ў 60-х гг. XIII ст. «полацкі» святы Юрый стаў гербам Навагародскага княства, а з 1313 г. – гербам Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, хаця лічыцца, што толькі ў 1384 г.




*Герб Літоўскай Русі і герб Чырвоннай Русі. На стужцы: «Святы Георгі заступнік Русі» (Холмская Русь. Исторические судьбы русского зарубежья. П.Н.Батюшков. С.-Петербургъ. 1887)*

Менавіта ў сярэдневякоўі, з умацаваннем Полацкага княства і пашырэннем яго межаў, пашыралася тэрыторыя выкарыстання полацкага герба. У любой краіне таго часу герб яе ўладара станавіўся гербам краіны; так і герб полацкіх Ізяславічаў, дзе б ні княжыў князь з гэтага роду, заўсёды змяшчаўся на пячатцы і на вайсковай харугве княства, з'яўляючыся яго дзяржаўным сімвалам.


АВСТРО-ВЕНГЕРСКІЙ ГЕРБЪ
ГЕРБЪ МАППЫ
ЛОДОМЕРІИ И ГАЛИЦІИ
ВОЛОДИМІРО ГАЛИЦКАГО ЦАРСТВА
1772 г.
ГЕРБЪ ЛИТОВСКОЙ РУСИ
ГЕРБЪ ЧЕРВОННОЙ РУСИ
ГЕРБЫ ЗЕМЕЛЬ
1388 г.
ЛИТОВСКОЙ
ЛЬВОВСКОЙ
ПЕРЕМЫШЛЬСКОЙ
ГАЛИЦКОЙ
ХОЛМСКОЙ
ГЕРБЫ ГУБЕРНІЙ
1869 г.
ЛЮБЛИНСКОЙ
СѢДЛЕЦКОЙ



Адна з першых…



XIV ст.



1425 г. Бергсхамерскі кодэкс



XV ст.

Магчыма, што яшчэ тады герб атрымаў сваю кароткую, як баявы покліч, назву-дэвіз «Пагоня!», што адлюстравала сэнс вайсковай справы ліцвінскай дзяржавы: дагнаць і адбіць у захопніка нарабаванае ім дабро і вызваліць захоплены ім палон, хаця ўпершыню зафіксавана назва «Пагоня» толькі ў гербоўніку Б. Папроцкага 1584 г.



Вершнік з дзідай – герб князя Жыгімонта-Карыбута. Малюнак з хронікі імператара Жыгімонта (1443)



1530 г.



1531г. Лаўрэнцеўскі спіс Статуту Вялікага княства

У 1539 г. Жыгімонт II Аўгуст унёс у малюнак «Пагоні» некалькі змен: на шлеме вершніка з'явіўся султан з пер'я, а на кані – трохраговай гунька з аблямоўкай.



1539 г.
Пячатка Жыгімонта II Аўгуста



2-я пал. XVI ст.
Гербоўнік Stemmata Polonica



1572 г.



1575 г. Гербоўнік Э.Комніна



1578 г. Хроніка Еўрапейскай Сарматыі




1605 г.



1550—1560 гг. Габелен, створаны па замове Жыгімонта Аўгуста



*1588 г. Трэці Статут Вялікага княства*



*1614 г. Віленскае выданне Статуту*



**1661-1662 гг.**
**Альбом Мейерберга**



**Тытулярнік цара**
**Аляксея Міхайлавіча**



**Портреты, гербы и печати большой государственной книги**
**1672 г. СПб. 1903**



*Портреты, гербы и печати большой государственной книги 1672 г. СПб. 1903*





*Портреты, гербы и печати большой государственной книги 1672 г. СПб.*







XVIII ст.





1720 г. На Пасольскай ізбе ў Каралеўскім замку Вавеля



На пано «Шэсце князёў» (Дрэздэн)



На «Вострай Браме» (Вільня)

Вядома выява «Пагоні» і са «зміем» – цмокам, ці драконам.



Але гэта выява магчыма адносіцца да Ордэну Дракона, заснаванага імператарам Жыгімонтам. Членам гэтага Ордэну ў 1429 г. стаў Вялікі князь Літоўскі, Рускі і Жамойцкі Вітаўт-Аляксандр. Згодна са статутам Ордэну, яго чальцы мелі права на размяшчэнне выявы дракона на сваім гербе, але адзіны парадак размяшчэння – кольцам вакол шчыта, як, напрыклад на гербе Вялікага князя і караля Уладзіслава-Ягайлы II, быў прыняты не з самага пачатку існавання Ордэну.



Такім чынам, герб «Пагоня» з'яўляўся афіцыйным дзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (Самагіцкага) з XIV ст. і да моманту яго скасавання ў канцы XVIII ст. На працягу гэтага часу пячаткамі з выявай «Пагоні» замацоўваліся ўсе важнейшыя міжнародныя дамовы Вялікага княства з Тэўтонскім ордэнам, Маскоўскім княствам, Швецыяй, Малдавіяй, Свяшчэннай Рымскай імперыяй, гарадамі Ганзы і іншымі дзяржавамі тых часоў.



*Вялікі і Малы Дзяржаўныя гербы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (згодна правілаў класічнай геральдыкі)*

Пра крывіцка-полацкае паходжанне герба з выявай святога Юрыя – нябеснага абаронцы Белай Русі і заступніка яе воінаў – сведчаць многія гістарычныя крыніцы. Так, у некалькіх старажытных летапісах, напрыклад у Густынскім або ў Прыбаўленні да Іпацеўскага, змешчаны сведчанні, што «…князь Витень нача княжить над Литвою измысли себе герб и всему княз-ству… печать: рыцер збройный на коне з мечом, еже ныне наречут пагоня». Тут неабходна заўважыць, што слова «ізмыслі» азначае не «прыдумаў» або «выдумаў», а «зрабіў» ці «набыў», гэта слова аднакарэннае з такімі словамі, як «промысел», «прамысловасць» і г. д. У гэтых жа летапісах знаходзяцца і сведчанні таго, што князь Віцень (1293—1316) – гэта прадстаўнік полацкага роду Ізяславічаў, патомак Вялікага князя кіеўскага святога Уладзіміра ў IX калене.

Гэтыя ж звесткі пацвярджаюць вядомыя расійскія вучоныя-гісторыкі, напрыклад, А. Лакіер, А. Кіркор, якія карысталіся і іншымі гістарычнымі крыніцамі, многія з якіх, на жаль, не захаваліся да нашага часу.

Меў такі герб і полацкі князь Глеб-Нарымунт (1277—1348), аб чым сведчыць яго пячатка, якой замацавана дамова Полацка і Рыгі 1330 г., а таксама «Хроніка Літоўская і Жамойцкая»: «Наримонт мел герб, або клейнот… а то такий: в гербе муж сбройный, на коню белом, в полю червоном, меч голый, якобы кого гонечи держал над головою, и есть оттоля названый «Погоня».

Аб тым, што гербам Полацкай Русі здаўна быў вершнік белы ў чырвоным полі, які трымаў шаблю (меч) перад сабой, гаворыцца і ў гістарычных даследаваннях расійскага вучонага-гісторыка В. М. Тацішчава: «Древнейшие манускрипты всю сию страну… Белая Русь именуют… И для сею… герб древнейший: всадник в белом платье… а Черной Руси, которой литовские князи похитили, в черном, киевский, или малороссийский, в красных одеждах были… Герб Белыя Руси издревле был всадник белый в красном поли, саблю имеюсчий пред собой».

Аднак, некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што герб «Пагоня» з'явіўся ў выніку дамоўленасці літоўскіх князёў з рыцарамі Лівонскага ордэна. Так, напрыклад, польскі сярэдневяковы гісторык С. Акольскі лічыў, што герб з выявай срэбнага шасціканцовага крыжа ў чырвоным полі быў падараваны Вялікаму князю Міндоўгу магістрам Лівонскага ордэна ад імя Папы

Інакенція IV (1243—1254) у знак удзячнасці за саюз з Ордэнам і прыняцце хрысціянства. У сувязі з гэтым, адзначаў гісторык, Міндоўг абяцаў не ўмешвацца ў дзейнасць Ордэна ў Прусіі і Жамойціі, у адказ крыжаносцы абяцалі Вялікаму князю сваю вайсковую дапамогу.

Іншыя гісторыкі сцвярджаюць, што князь Нарымонт (1277—1348) атрымаў гэты герб ад магістра Лівонскага ордэна Флядэра, на дочках якога былі жанаты князь і яго брат Даўмонт. Але больш верагодна, што Нарымонт і Даўмонт абралі сабе герб полацкіх князёў яшчэ да жаніцьбы на дочках магістра, а неабходнасць абрання гэтага герба была прадыктаваная палітычным разлікам – трэба было паказаць, што Нарымонт і Даўмонт маюць старажытны герб і паходзяць са старажытнага роду, а таму яны лічаць сябе роўнымі, а магчыма, і вышэйшымі за магістра ордэна. Дарэчы, такім жа чынам паступіў і князь Аляксандр Яраславіч, які запазычыў герб полацкіх князёў, ажаніўшыся на дачцэ полацкага князя.

Найбольш падрабязнае апісанне герба «Пагоня» прыведзена ў летапісным спісе пачатку XVII ст. (захоўваецца ў бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу), які з'яўляецца копіяй старажытнага летапісу: «Пишуть наши кройники руские, и Наримунт был першим автором гербу або клейноту великого князства литовского: в гербе муж збройный, на коню белом в полю червоном, мечь голый, яко бы кого гонячи держал над головою, и есть оттоля тот названный погоня».

На працягу наступных некалькіх стагоддзяў уладарамі Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага заставаліся полацкія Ізяслаўічы: брат Віценя – Гедымін (княжыў у 1316—1341 гг.), сын Гедыміна – Альгерд (княжыў у 1345—1377 гг.), яго пляменнік Вітаўт-Аляксандр (княжыў у 1392—1430 гг.), яго сын Ягайла-Уладзіслаў (княжыў і быў каралём Польшчы ў 1377—1434 гг.).



*Пячатка Ягайлы – «Божжай міласцю караля Літвы» (1380)*



*Малюнак з хронікі імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Жыгімонта (1443), які пасрэднічае між Тэўтонскім ордэнам і каралём Ягайлам (пад «Пагоняй»)*

Дарэчы, вялікі князь Альгерд, трэці сын Гедыміна ад першай жонкі, князёўны Марыі Віцебскай, меў пяць сыноў, якія былі ахрышчаны паводле праваслаўнага абраду: Андрэй (князь Полацкі), Дзмітрый (князь Бранскі), Канстанцін, Уладзімір і Хведар; ад другой жонкі – князёўны Улляны Цвярской, меў сем сыноў, якія былі ахрышчаны паводле каталіцкага абраду: Ягайла-Уладзіслаў, Скіргайла-Іван, Карыбут-Дзмітрый, Лінгвен-Сямён, Карыгайла-Казімір, Вігунт-Аляксандр і Свідрыгайла-Баляслаў.



«Аляксандр-Вітовд, Божжай літасцю Вялікі князь Літваніі» (1385, 1386)



«Аляксандр, інакш Вітовд, князь Літваніі і іншых» (1407)



Пячатка Аляксандра (1426)





Пячаткі Вялікага князя Вітаўта



Пячатка Свідрыгайлы
(1420-1422)



Пячатка Жыгімонта Кейстутавіча
(1436)



Пячатка Жыгімонта Кейстутавіча



Пячатка Аляксандра (1501)

Таксама вядомы пячаткі і гербы выявамі, падобнымі «Пагоні», якія ўжываліся ў некаторых дзяржаўных утварэннях, існаваўшых на тэрыторыях, не ўваходзіўшых у склад Вялікага княства Літоўскага.



*Магчыма, герб Вялікага княства Цвярскога (вершнік з сокалам?)*



*Гербы Ноўгарада Вялікага і Вялікага княства Цвярскога (Альбомъ Мейерберга. Виды и бытовыя картины Россіи XVII века. Рисунки Дрезденскаго альбома, воспроизведенные съ подлинника въ натуральную величину съ приложеніемъ карты пути цесарскаго посольства 1661—62 гг. Изданіе А. С. Суворина. 1903)*



*Татарская Пагоня*

Канчатковае юрыдычнае афармленне «Пагоні» было зроблена Статутамі Вялікага княства 1566 і 1588 гг., дзе сказана і аб абавязковым ужыванні выявы герба на пячатках і харугвах ваяводстваў і паветаў цяперашніх этнічных беларускіх тэрыторый (Статут ВКЛ 1566 г., частка 4, артыкул 10; Статут 1588 г., частка 4, артыкул 12): «Теж мы господар даем под гербом того панства нашего Великого Князства Литовского, Погонею, печать до кождого повету».



*Трэці Статут ВКЛ (1588)*



*Выява герба Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага на сцяне каралеўскага палацу (Вавель, Кракаў) – найбольш поўны: утрымлівае гербы з выявамі «Пагоні» дзевяці ваяводстваў (першая і другая часткі першай чвэрці, другая, трэцяя і чацвёртая часткі другой чвэрці; усе чатыры часткі трэцяй чвэрці), гербы Жмудзі (трэцяя частка першай чвэрці), Кіеўскага (першая частка другой чвэрці) і Смаленскага ваяводстваў (чацвёртая чвэрць), а у «сэрцы» – радавы герб Гедымінавічаў «Слупы»*

**Гербы «беларускіх» ваяводстваў Вялікага княства (1720)**



*Мсціслаўскае, Берасцейскае, Менскае*



*Падляшскае, Полацкае, Трокскае*



*Віцебскае*




*Герб Віцебскага ваяводства з гербамі іншых ваяводстваў Вялікага княства.*





*Сучасны герб Віцебская вобласці*

Гербам жа Жамойціі, гістарычным нашчадкам якой з'яўляецца Рэспубліка Літува, быў чорны мядзведзь (локіс), стоячы на задніх лапах. Першая вядомая выява гэтага герба датуецца 1492 г., калі яго выява была змешчана на кубку, выробленага для Вялікага князя Аляксандра II.



Першае апісанне герба Жамойціі, або Жмудзі датуецца 1584 г. У выдадзеным у гэтым годзе гербоўніку Бартоша Папроцкага паведамляецца, што мядзведзь чорны ў чырвоным полі, на шыі мядзведзя – ашыйнік. Згодна правілаў геральдыкі ашыйнік сімвалізуе пакору, скарэнне. Магчыма такім чынам было адлюстравана ўключэнне Жмудзі ў склад вялікага княства.

З 1669 г. выява герба Жмудзі, як аднаго з тэрытарыяльных гербаў Вялікага княства, пачала змяшчацца на Вялікай Дзяржаўнай пячатцы Вялікага княства.



*Герб Жамойцкага староства ВКЛ*

Выява герба Жмудзі ёсць таксама і ў гербоўніку 1578 г., на некаторых манетах вялікага княства. Аб ім пісаў паэт-літвін Адам Міцкевіч у паэме «Пан Тадэвуш», кажучы аб паўстанні супраць расійскіх акупацыйных улад: «Хай тут, пачуўшы заклік, заржэ „Пагоня“, зараве „Мядзведзь“ у Жмудзі…».

Такім чынам, гістарычны герб Жмудзі – мядзведзь. Аднак ён не стаў гербам ні губерняў Расійскай імперыі, што былі створаны на тэрыторыі цяперашняй Рэспублікі Літувы, ні створанай у 1919 г. незалежнай Рэспублікі Літувы.

Наогул, гербы Сувалкаўскай і Ковенскай губерняў, зацверджаныя, адпаведна 25 лютага 1869 г. і 5 ліпеня 1878 г., напэўна былі пладамі фантазіі чыноўнікаў расійскай герольдыі: у залатым полі першага – на чорным пагорку зялёная елка, па якой два хвалістых блакітных пасы; у блакітным полі другога – срэбны помнік, узведзены ў Коўна на ўспамін вайны 1812 г., які ўпрыгожаны залатымі імператарскімі арламі і ўвянчаны залатым рускім, з двума перакладзінамі ўверсе, крыжом. Кожны герб акружаны залатымі дубовымі галінкамі, перавітымі блакітнай Андрэеўскай стужкай і увянчаны залатой імператарскай каронай.





Гербам жа ўтворанай у жніўні 1919 г. незалежнай Літувы стаў «Віціс».



На самой справе, гэта герб Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, а дакладней – старажытны герб Полацкага княства, «Пагоня». Аднак у літувіскай мове няма дакладнага слова для перакладу ліцвінска-беларускага слова «Пагоня», то для назвы герба быў выкарыстаны прапанаваны ў 1845 г. літувіскім гісторыкам С. Даукантасам літувіскі варыянт слова «віцязь» – «рыцар» і ў Канстытуцыях Літувы 1922 г., 1928 г. і 1938 г. яе дзяржаўны герб апісваецца, як «у чырвоным полі белы (срэбны) Віціс». Аднак эталон гэтага дзяржаўнага гербу ніколі не быў зацверджаны, таму варыянтаў выяваў герба існуе мноства.




*Вокладка аднаго з першых выданняў тэкста, які потым стаў нацыянальным гімнам Літувы (1908)*

Толькі ў 1925 г. скульптарам Юозасам Зікарасам была створана выява гербу, якая затым да 1940 г. ужывалася на манетах, знаках і некаторых пячатках Літувы.

















Аднак яшчэ ў перыяд існавання першай рэспублікі, шмат якія палітыкі і грамадскія дзеячы Літувы выказвалі прапановы аб прыняцці ў якасці дзяржаўнага гербу Літувы замест

«Віціса» другога, створанага на аснове сімвалаў гістарычных земляў. Так, напрыклад, у 1935 г. прэм'ер-міністр Тубаліс, выступаючы ў сойме, афіцыйна заявіў аб «нелітувіскім» паходжанні «Віціса» і аб тым, што распачата праца па стварэнню новага дзяржаўнага гербу на аснове гістарычнага гербу Жмудзі.



На жаль, праца гэта не была скончана з-за ўстанаўлення ў Літуве ў 1940 г. савецкай улады. Таму малюнак «Віціса, створаны ў 1925 г. скульптарам Юозасам Зікарсам, быў выкарыстаны і ў якасці эталона дзяржаўнага гербу Літувы, зацверджанага пасля аднаўлення незалежнасці краіны 10 красавіка 1990 г. Але ў хуткім часе на гербе Літувы колер шчыта вершніка з чырвонага, што не адпавядала гістарычным колерам «Пагоні», быў зменены на блакітны, а крыж застаўся залатым, бо амаль да канца XVIII ст. шчыт вершніка «Пагоні» быў блакітны, а крыж – залаты.



Герб Літувы, зацверджаны 10.04.1990



Герб Літувы, зацверджаны 04.09.1991

З 1386 г., калі паміж Польшчай і Вялікім княствам была заключана ўнія, «Пагоня» стала часткай агульнага дзяржаўнага герба.

Першапачаткова і «Пагоня», і польскі арол, займала толькі па адной частцы герба, а ў астатніх знаходзіліся гербы іншых уладанняў, а асабісты ці радавы герб караля размяшчаўся, згодна правіл еўрапейскай геральдыкі, «у сэрцы» – сярэдзіне Дзяржаўнага гербу.



Малая пячатка Ягайлы (1416)



Пячатка Аляксандра (1501)



*Гербы зямель, знаходзіўшыхся ў складзе Рэчы Паспалітай у час кіравання Аляксандра*



*Габелен, належыўшы Жыгімонту Аўгусту, з выявай поўнага герба Рэчы Паспалітай, які складалі гербы Польшчы, Вялікага княства, Кіеўскай Зямлі, Валыні і Жмудзі, а «у сэрцы» – радавы герб Сфорцаў (каля 1548 г.).*

Але ўжо з 1501 г. выкарыстоўваліся і выява герба, дзе ў чатырохчаствовым шчыце знаходзіліся толькі гербы Польшчы і Вялікага княства.

 

Аб'яднаны герб Рэчы Паспалітай
і яго сучасная рэканструкцыя.



Пячатка Аляксандра (1501)



Пячатка Жыгімонта Старога (1533)



Пячаткі Жыгімонта Аўгуста (1554, 1570)



*Малы герб Рэчы Паспалітай на дукаце*
*Жыгімонта III Вазы (1617)*




Жыгімонт III Ваза (1587—1632). Міхаіл Вішнявецкі (1669—1673)



Ян III Сабескі
(1674-1696)



Фрыдрых-Аўгуст Саксонскі
(1697-1706, 1709-1733)



Станіслаў Ляшчынскі
(1706-1709, 1733-1735)



Станіслаў-Аўгуст Панятоўскі
(1764-1795)




*Герб Рэчы Паспалітай у часы Жыгімонта III Вазы*



*Габелен з выявай герба Ганны-Кацярыны-Канстанцы (1619—1651) – дачкі Жыгімонта III Вазы (1630—1640)*

Дарэчы, нароўні з выявай аб'яднанага гербу Рэчы Паспалітай у некаторых гербоўніках і іншых крыніцах сустракаюцца выявы, дзе «Пагоня» і польскі арол знаходзяцца побач, што, напэўна, больш дакладна адлюстроўвае канфедэратыўны строй гэтага дзяржаўнага ўтварэння.



Гербоўнік Конрада фон Груненберга (1480).



Гербоўнік першай паловы XVI ст.




Плакат, выдадзены ў гонар Крэўскай уніі (1861)

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай на частцы тэрыторыі цяперашняй Беларусі, якая апынулася ў складзе Расійскай імперыі, былі ўтвораны новыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – намесніцтвы, гарадам якіх у хуткім часе імператрыцай Кацярынай II былі «дараваны» гербы.



*Медаль «Въ память присоединенія западно-русскихъ областей къ Россіи» («Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-Западного края при императрице Екатерине II (1792—1796). Вильна. 1903»).*

Так, 21 верасня 1781 г. былі «дараваны» гербы з выявай «Пагоні» гарадам Полацкага намесніцтва: Веліжу, Віцебску, Гарадку, Дзвінску, Дрысе, Люцыну, Невелю, Полацку, Рэжыцэ, Себежу і Суражу:

«21 сентября 1781 года.

Высочайше утвержденный доклад Сената. Об утверждении гербов городам Полоцкого Наместничества.

Доклад.

По Именному Вашего Императорского Величества указу, учреждено Полоцкое Наместничество и к оному приписаны города; но как те приписные города гербов не имели, то по приказанию Сената правящим должность Герольдмейстера, Действительным Статским Советником Волковым, городам, сие Наместничество составляющим, гербы сделаны и с описанием их представлены Сенату.

Сенат, рассмотрев, осмеливается всеподданнейше предоставить оные на Высочайшую Вашего Императорского Величества конфирмацию, и просит Высочайшего указа».

На гэтым дакладзе Сенату маецца рэзалюцыя імператрыцы: «Быть по сему».

Цікавым дакументам з'яўляецца «Описание гербам городов Полоцкого Наместничества»:

«I. Полоцк. Щит разрезан на двое: в верхней части онаго в золотом поле Российской Империи половина Государственного герба двуглавого орла, а в нижней части в серебряном поле старый Полоцкий герб, на коне воин, держащий в правой руке саблю, а на левой руке надетый красный щит с двойным на оном крестом. Герб Государственный, поставленный над гербом Полоцким, означает подданство к России сего города с принадлежащими к Полоцкому Наместничеству городами.

А как прочие сего Наместничества города особливых гербов в Польское владение не имели, а употребляли только знамена с изображением такового же конного воина, как и город Полоцк, и различались одним цветом знамен своих; что и взято в основание, и гербы сделаны всем городам одинакие, и различаются между собой только разных цветов щитами, а именно:

II. Дрисесский. Золотое поле.

III. Себежский. Голубое поле.

IV. Невельский. Зеленое поле.

V. Динабургский. Пурпуровое поле.

VI. Резицкий. Горностаевое поле.

VII. Люцинский. Черное поле.

VIII. Витебский. Красное с серебром полосатое поле.

IX. Велижский. Шахматное поле серебряное с красным.

X. Городецкий. Полосатое голубое с золотом поле.

XI. Суражский. Разделенное на четыре части: красное, золотое, серебряное и голубое поле».




*Гербы гарадоў Полацкага намесніцтва*

Такім чынам, былі зацверджаны гербы, створаныя на аснове герба Полацкага ваяводства Вялікага княства, нават на гербе застаўся падвойны крыж.

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «Литрес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на Литрес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.